ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
1
САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 7 (1420)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

## 4 сакавіка—Дзень выбараў у Вярхоўны Савет СССР. Аднадушна аддадзім свае галасы за кандыдатаў народа!

"Беларускі універсітэт"
**тэлетайп**
• Учора • Сёння • Заўтра •

### *У фальклорную экспедыцыю*

па Капыльскаму раёну ў час зімовых канікулаў выязджаў фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш». Удзельнікамі мастацкай самадзейнасці былі запісаны беларускія народныя песні і абрады, а таксама дадзена чатыры канцэрты.

В. ГЛАДКАЯ,
кіраўнік ансамбля.

### *Фотавыстаўка*

арганізавана па ініцыятыве дэканата завочнага факультэта. На ёй прадстаўлены работы студэнтаў-завочнікаў факультэта журналістыкі. З вялікай цікавасцю знаёмяцца студэнты і супрацоўнікі універсітэта з фотаздымкамі А. Кляшчука, В. Вiткоўскага, А. Крыштаповіча, А. Каркатадзе і іншых аўтараў.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### *З вялікім поспехам*

у міжнародным маладзёжным цэнтры «Юнацтва» выступілі камерны аркестр і ансамбль бандурыстаў Львоўскага дзяржаўнага універсітэта імя І. Франко і музычна-паэтычны тэатр «Юнацтва» Днепрапятроўскага дзяржаўнага універсітэта імя 300-годдзя уз'яднання Украіны з Расіяй. Калектыў тэатра на суд гледачоў вынес праграму па кампазіцыі Р. Раждзественскага «210 крокаў», а таксама гумарыстычную праграму «Зноў — 45».

У. МАКАРЭВІЧ,
дырэктар студэнцкага клуба.

### *Прэзідыум прафкома*

заслухаў справаздачу аб рабоце калектываў мастацкай самадзейнасці і разгледзеў задачы па далейшаму развіццю мастацкай творчасці супрацоўнікаў універсітэта. З дакладам выступіла старшыня культурна-масавай камісіі прафкома Г. Р. Казлова.

На пленуме з дакладам аб рабоце прафсаюзнага бюро факультэта радыёфізікі і электронікі выступіў старшыня прафбюро І. С. Манак.

А. РУХЛЯ,
намеснік старшыні прафкома супрацоўнікаў.

### *Частыя госці*

метрабудаўнікоў — студэнты факультэта журналістыкі. Будучыя журналісты працуюць тут на суботніках, выступаюць з канцэртамі. Надоўга запомніцца метрабудаўнікам і канцэрт, з якім напярэдадні Дня Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту выступілі студэнты.

І. КАЖЭЎНІКАВА,
студэнтка факультэта журналістыкі.




*Вясна, вясна жаданая,*
*Ты прыйдзеш зноў, ты вернешся...*

*Каму з дзяцінства не вядомы гэтыя радкі? Успомніш іх і з яшчэ большай сілай пачынаеш адчуваць цёплы подых вясны-прыгажуні. Яшчэ не чуваць капяжу са стрэх, не відаць ручайкоў, яшчэ не зняла з сябе коўдру заспаная зямля, але блізкасць цеплыні, росквіту прыроды ўжо адчуваецца.*

*Пачалася вясна святла. І прачынаемся мы ўжо не ад званка будзільніка, а ад таго, што свавольнае сонца зазірнула ў пакой і ласкава пагладзіла сваімі праменнямі наш твар. Вясна святла. Потым будзе вясна вады, вясна цяпла. Кожны год гэта пара праходзіць у нашым жыцці, і заўсёды яна незвычайная, асабістая, непаўторная.*

*У студэнткі другога курса біялагічнага факультэта Валі Ціхановіч, якую вы бачыце на здымку, яшчэ адно свята — 29 лютага ў яе дзень нараджэння. 29 лютага, раз у чатыры гады. Гэта і добра, і ў той жа час — не зусім. Добра, таму што заўсёды здаешся маладзейшай: людзі чатыры разы святкуюць свой дзень нараджэння, яна — раз. Вось і атрымліваецца, што чатыры гады ўзрост не мяняецца. А дрэнна, бо і віншуюць жа за гэты час толькі адзін раз...*

*С. ПЛЫТКЕВІЧ.*

## ЗА МІР І БЯСПЕКУ НАРОДАЎ

**СУСТРЭЧА ВЫБАРШЧЫКАЎ З А. А. ГРАМЫКАМ.**

ШЧЫРУЮ ўдзячнасць Цэнтральнаму Камітэту КПСС і Савецкай дзяржаве, якія вядуць велізарную работу па захаванню і ўмацаванню міру, ажыццяўленню прынятай XXVI з'ездам КПСС Праграмы міру на 80-я гады, выказалі ўдзельнікі сустрэчы выбаршчыкаў Мінскай — Маскоўскай выбарчай акругі, якая адбылася 27 лютага, з кандыдатам у дэпутаты Савета Саюза Вярхоўнага Савета СССР членам Палітбюро ЦК КПСС, першым намеснікам Старшыні Савета Міністраў СССР, міністрам замежных спраў СССР Андрэем Андрэевічам Грамыкам.

Давераная асоба кандыдата ў дэпутаты — рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, акадэмік Акадэміі навук БССР Л. І. Кісялеўскі расказаў аб жыццёвым шляху А. А. Грамыкі, аб яго ўкладзе ў распрацоўку і ажыццяўленне знешнепалітычных ініцыятыў нашай краіны, заклікаў выбаршчыкаў аднадушна аддаць галасы за кандыдатаў непарушнага блоку камуністаў і беспартыйных.

На сходзе выступілі апаратчыца вытворчага аб'яднання «Мінмедпрэпараты» Т. Г. Сафонава, першы сакратар Маскоўскага райкома партыі Мінска Б. А. Саўчанка, брыгадзір электрамантажнікаў вытворчага аб'яднання індустрыяльнага домабудавання Герой Сацыялістычнай Працы С. Ф. Акуліч, настаўніца сярэдняй школы № 127 І. В. Кірук, генеральны дырэктар вытворчага абутковага аб'яднання «Прамень» Б. В. Пазняк, студэнтка медыцынскага інстытута Т. П. Дзюбкова.

Выступаўшыя гаварылі аб аднадушным адабрэнні калектывамі працоўных рашэнняў лютаўскага (1984 г.) Пленума ЦК КПСС, які пацвердзіў прынцыповы курс нашай партыі і дзяржавы на пазбаўленне чалавецтва ад пагрозы сусветнай ядзернай вайны, умацаванне давер'я, узаемаразумення і супрацоўніцтва народаў. Яны падкрэслівалі, што наш народ — за мірнае рашэнне спрэчных міжнародных пытанняў шляхам перагавораў. Роўнасць і аднолькавая бяспека, неўмяшанне ва ўнутраныя справы адзін аднаго — такіх прынцыпаў адносін паміж краінамі прытрымліваўся і будзе прытрымлівацца СССР.

Мінчане, як і ўсе савецкія людзі, заяўляюць аб гатоўнасці аддаць галасы за кандыдатаў блока камуністаў і беспартыйных, прыкласці ўсе сілы і энергію для паспяховага ажыццяўлення рашэнняў XXVI з'езда КПСС, наступных Пленумаў ЦК КПСС. Ва ўмацаванні эканамічнай і абароннай магутнасці нашай Радзімы — надзейная гарантыя міру і бяспекі народаў.

Цёпла сустрэты выбаршчыкамі, на сходзе з прамовай выступіў А. А. Грамыка.

● ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ ●

# ІСЦІ ДАЛЕЙ, ДАБІВАЦЦА БОЛЬШАГА

КАЛЕКТЫЎ універсітэта, як і ўвесь савецкі народ, уступіў у чацвёрты год XI пяцігодкі. Шырокі дыяпазон пытанняў вырашаюць партыйная арганізацыя, камуністы флагмана вышэйшай школы рэспублікі.

Няма неабходнасці гаварыць, што галоўная задача універсітэта, як і любой ВНУ, — даць устойлівыя прафесійныя веды будучаму спецыялісту ў галіне навукі, тэхнікі, вытворчасці, культуры, і гэтай асноўнай задачы павінны быць падпарадкаваны ўсе астатнія.

Курс партыі на інтэнсіфікацыю, аб якім гаворыцца ў шэрагу партыйных дакументаў, патрабуе ад кожнага з нас дакладнага ўяўлення, наколькі правільна рыхтуецца і размяркоўваецца малады спецыяліст, наколькі поўна ўлічаны патрэбы народнай гаспадаркі ў спецыялістах пэўнага профілю, як і якім чынам выкарыстаць асабістыя здольнасці і схільнасці кожнага выпускніка універсітэта. Гэту задачу мы можам паспяхова вырашыць толькі шляхам устанаўлення цеснай сувязі з прадпрыемствамі, установамі, дзе будзе працаваць будучы выпускнік.

Наш універсітэт назапасіў пэўны вопыт па падрыхтоўцы кадраў па прамых сувязях з вытворчасцю, установамі навукі і культуры. Па мэтавых дагаворах універсітэт падрыхтаваў для прадпрыемстваў рэспублікі ў 1982 годзе 400 чалавек, у 1983 — 490 чалавек. Для ВА «Інтэграл» у перыяд з 1985 да 1990 года плануецца падрыхтаваць больш за 1100 чалавек. У адпаведнасці з дагаворам аб супрацоўніцтве ў рамках вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання «БДУ — ВА «Інтэграл» універсітэт рыхтуе для прадпрыемства спецыялістаў па радыёфізіцы, электроніцы, фізіцы, хіміі. Асноўную нагрузку тут нясуць кафедры фізікі паўправаднікоў, фізічнай оптыкі, радыётэхнікі і фізічнай электронікі, неарганічнай і фізічнай хіміі. Магчыма, такая форма супрацоўніцтва, перш за ўсё з перадавымі прадпрыемствамі рэспублікі, неабходна і для іншых кафедраў прыродазнаўчага профілю (размова ідзе аб неабходнасці пастаяннага пошуку новых форм супрацоўніцтва з вытворчасцю).

Мы маем прыклады супрацоўніцтва і па гуманітарных факультэтах. Напрыклад, юрыдычны факультэт мае цесны дагаворны кантакт з Пракуратурай БССР, Міністэрствам юстыцыі, МУС БССР, з Інстытутам філасофіі і права АН БССР; гістарычны факультэт падтрымлівае ўстойлівыя сувязі з Інстытутам гісторыі АН БССР; факультэт журналістыкі традыцыйна супрацоўнічае з Дзяржтэлерадыё, рэдакцыямі газет «Мінская праўда», «Звязда», «Советская Белоруссия», «Сельская газета».

Рэктарату, саветам факультэтаў неабходна ўзмацніць работу па стварэнню новых вучэбна-навукова-вытворчых аб'яднанняў, і не толькі для прыродазнаўчых факультэтаў. Мэтазгодна, напрыклад, падумаць аб стварэнні аб'яднання «БДУ—сельгасраён», да работы ў якім можна прыцягнуць палітэканомаў, сацыёлагаў, географаў, біёлагаў, журналістаў. Ёсць усе ўмовы для стварэння і гарантаванай дзейнасці вучэбна-навуковых цэнтраў «НДІ ФХП — хімфак», «НДІ ПФП — фізфак, факультэт радыёфізікі і электронікі» і іншыя. Натуральна, што асноўная нагрузка пры вырашэнні гэтага складанага пытання кладзецца на саветы факультэтаў, якім неабходна даць больш правоў у пытаннях планавання навуковых даследаванняў па гаспадарча-бюджэтных і асабліва па гаспадарча-дагаворных тэматыках.

Сучасны ўзровень навукі, тэхнікі, вытворчасці патрабуе навуковай арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы, пошуку і шырокага ўкаранення новых форм і метадаў навучання, усямернай інтэнсіфікацыі вучэбнага працэсу на аснове комплекснага выкарыстання тэхнічных сродкаў, вылічальнай тэхнікі, кіно, радыё, тэлебачання.

У пастановах партыі і ўрада па вышэйшай школе падкрэсліваецца роля універсітэтаў як вядучых навуковых цэнтраў. Іменна універсітэты шырока праводзяць даследаванні практычна ва ўсіх галінах ведаў, якія вызначаюць развіццё айчыннай і сусветнай навукі, валодаюць вялікім інтэлектуальным патэнцыялам, здольным уздзейнічаць на паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу.

У 1983 годзе ва універсітэце было ўкаранёна ў вытворчасць 141 і ў вучэбны працэс 95 навукова-даследчых работ (акрамя падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў). Эканамічны эфект ад укаранення навукова-даследчых работ склаў 21,9 млн. рублёў. Атрымана 210 станоўчых рашэнняў на выдачу аўтарскіх пасведчанняў. Выдадзена 310 работ, з іх 53 манаграфіі, 201 падручнік і вучэбны дапаможнік, 23 зборнікі навуковых прац. Універсітэт выконвае больш як 300 дагавораў аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве.

У якой ступені аптымальныя гэтыя лічбы з пункту гледжання сучасных патрабаванняў да універсітэцкай навукі — пытанне складанае і адказ на яго неадназначны. Аднак, як гэта робіцца ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці, аб эфектыўнасці навуковых даследаванняў патрэбна меркаваць па канчатковаму прадукту.

Возьмем укараненне нашых навуковых дасягненняў. Па справаздачных даных у 1983 годзе ўкаранёна ў вытворчасць 141 тэма. Тут размова ідзе аб аднаразовых укараненнях. Укараненні серыйныя, масавыя адсутнічаюць (за выключэннем такога віду ўкаранення, як манаграфія). Можна было б неяк растлумачыць гэты факт, калі б ва універсітэце не было такога прамежкавага звяна «навука—вытворчасць», як наша канструктарска-тэхналагічнае бюро з вопытнай вытворчасцю, у якім працуе каля 400 чалавек.

Да цяперашняга часу яго прадукцыя была ў цэлым нядрэнная, але характэрная хутчэй для навукова-даследчых інстытутаў, асабліва калі гаварыць аб прыладабудаванні. Ва універсітэце ёсць што ўкараняць. Ёсць шмат унікальных распрацовак у нашых інстытутах, на кафедрах фізічнага, хімічнага факультэтаў. Неабходна даць належны ход гэтым распрацоўкам.

У сувязі з гэтым рэктарату, дырэктарам інстытутаў і СКТБ з ВВ неабходна ў самыя кароткія тэрміны вызначыць канкрэтную перспектыву ўкаранення лепшых распрацовак у серыю. Прычым у гэтым пытанні патрэбна пачаць з дзвюх-трох распрацовак, але давесці справу да лагічнага завяршэння. Арыентавацца, магчыма, патрэбна на рэспубліканскія прадпрыемствы, сувязь з якімі неабходна пастаянна расшыраць і паглыбляць.

Сказанае ні ў якой ступені не павінна азначаць, што ўсе павінны займацца прыкладнымі задачамі. Ва універсітэце развіваюцца і павінны развівацца фундаментальныя і пошукавыя даследаванні.

Мы пастаянна гаворым, што не выконваецца план абароны доктарскіх дысертацый. Гэта сапраўды так. Магчыма, гэтую праблему патрэбна разглядаць і такім чынам, што ў многіх выпадках выконваемыя тэмы не адпавядаюць сучаснаму ўзроўню навукі, тэхнікі, вытворчасці і, як правіла, узроўню, які прад'яўляецца да доктарскіх дысертацый.

Калі зазірнуць зноў на прыродазнаўчыя факультэты, то атрымліваецца не зусім прыемная карціна: больш чым палову кафедраў узначальваюць не дактары навук. Здалі ў цэлым свае пазіцыі нашы фізікі: за апошнія гады не вылучана ніводнай работы на атрыманне Дзяржаўных прэмій СССР і БССР. Выключэннем з'яўляецца кафедра ядзернай фізікі, дзе ў апошнія гады зроблена адкрыццё і вылучана сур'ёзная работа прыкладнога характару на прэмію Савета Міністраў СССР.

Неабходна ў гэтым пытанні больш уважліва паглядзець на нашы інстытуты, асабліва тым кафедрам, дзе асноўныя паказчыкі яшчэ вельмі нізкія. Зараз нашы інстытуты сталі больш самастойнымі: яны маюць добрую матэрыяльную базу, і, галоўнае, там сфарміраваны вялікія групы супрацоўнікаў высокай кваліфікацыі, якія ўжо абаранілі ці хутка абароняць доктарскія дысертацыі. Пытанне навуковага супрацоўніцтва вельмі далікатнае, таму ў яго вырашэнні асноўная роля адводзіцца загадчыкам кафедраў і лабараторый.

Як нам здаецца, навуковыя поспехі і прызнанне навуковых дасягненняў гуманітарных кафедраў больш здавальняючыя. Можна адзначыць шэраг манаграфій, якія выйшлі зусім нядаўна і атрымалі высокую ацэнку навуковай грамадскасці краіны. Сярод іх манаграфія прафесара В. С. Сцёпіна «Формирование научной теории», якая выйшла ў Хельсінкі; калектыўная манаграфія «Общество против человека. Критика антигуманной сущности современного капитализма» пад рэдакцыяй доктара філасофскіх навук Ю. А. Гусева; кніга калектыву аўтараў пад кіраўніцтвам прафесара А. С. Кляўчэні «Проблемы взаимосвязи философской и общественной мысли в Белоруссии с философией других народов». Гэта працы нашых прафесараў Н. С. Гілевіча, С. Х. Александровіча, Ф. І. Куляшова, П. І. Ткачова, А. А. Лойкі, Е. Л. Бондаравай, П. П. Шубы, А. Я. Супруна, В. А. Кулажанкі і многіх іншых.

Самы эфектыўны сродак дасягнення высокіх канечных вынікаў — сацыялістычнае спаборніцтва, далейшае развіццё творчай ініцыятывы супрацоўнікаў. Ва універсітэце склалася і пастаянна ўдасканальваецца сістэма сацыялістычнага спаборніцтва. Аднак нам яшчэ не ўдалося выкарыстаць вялікія магчымасці сацспаборніцтва для павышэння эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчай работы, больш поўнага выкарыстання навуковага патэнцыялу універсітэта. Прафсаюзнаму камітэту, агульнауніверсітэцкай камісіі па сацыялістычнаму спаборніцтву неабходна больш аператыўна рэагаваць на перадавы вопыт, назапашаны ў падраздзяленнях, на станоўчы вопыт арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва ў ВНУ краіны.

На працягу трох гадоў пяцігодкі найбольш высокія і стабільныя рэзультаты па выніках сацспаборніцтва маюць фізічны факультэт і факультэт радыёфізікі і электронікі. Нізкія, няроўныя паказчыкі ў факультэтаў журналістыкі, біялагічнага і геаграфічнага. Юрыдычны факультэт значна палепшыў сваю работу і ў 1983 годзе выйшаў у лік прызёраў сацыялістычнага спаборніцтва (у 1982 годзе ён заняў 9-е месца).

Якаснае вырашэнне праблем, аб якіх тут сказана, поўнасцю залежыць ад нашай кадравай палітыкі. Тут у нас далёка не ўсё добра. Я прывяду толькі некаторыя прыклады кадравага стану спраў і некаторыя лічбы.

Сярэдні ўзрост навукова-педагагічных работнікаў універсітэта складае больш за 44 гады. Сярэдні ўзрост прафесара — 58 гадоў, дацэнта — 48 гадоў. Пры больш канкрэтным разглядзе ўзроставай структуры навукова-педагагічных кадраў можна выявіць і больш высокія ўзроставыя межы. Так, сярод 7 дактароў, прафесараў гістфака 50 працэнтаў — ва ўзросце за 60 гадоў. На факультэце журналістыкі старэй за 60 гадоў — 66,6 працэнта дактароў, прафесараў; на геаграфічным факультэце з 7 прафесараў ва ўзросце больш за 60 гадоў — 6 чалавек.

Менш за ўсё выкладчыкаў з вучонымі ступенямі і званнямі на факультэце прыкладной матэматыкі і механіка-матэматычным факультэце. На кафедры агульнага праграміравання (ФПМ) няма ніводнага выкладчыка з вучонай ступенню, на кафедры лічбавых метадаў і праграміравання (мехмат) менш за 30 працэнтаў выкладчыкаў маюць вучоныя ступені і званні. На факультэце радыёфізікі і электронікі толькі тры кафедры з васьмі ўначальваюць дактары навук. На ФПМ — самым вялікім факультэце універсітэта—працуе толькі тры дактары навук, з іх два — загадчыкі кафедраў (усяго на факультэце 9 кафедраў).

Гэта ўсё недахопы нашай работы з кадрамі. Такая сітуацыя — вынік нездавальняючай кадравай палітыкі партыйнага камітэта, рэктарата. Гэта, напэўна, наша самае складанае пытанне, у вырашэнне якога павінны актыўна ўключацца саветы факультэтаў, кафедры, усе работнікі вышэйшай кваліфікацыі універсітэта.

Сціслыя рамкі газетных старонак не дазваляюць больш падрабязна спыніцца на тых праблемах, якія клапоцяць партыйны камітэт, усіх камуністаў універсітэта. Дасягнутае калектывам універсітэта дае падставу быць упэўненым, што флагман вышэйшай школы рэспублікі на аснове актыўнай жыццёвай пазіцыі кожнага студэнта, выкладчыка, супрацоўніка будзе ісці далей, дабівацца большага.

**М. ДЗЯМЧУК,**
**сакратар парткома універсітэта.**

## ● РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ! ●



МАЛОДШЫ НАВУКОВЫ супрацоўнік лабараторыі экстракцыйных і сарбцыйных працэсаў НДІ фізіка-хімічных праблем пры БДУ імя У. І. Леніна Аляксандр Львовіч Гулевіч, якога вы бачыце на здымку, займаецца распрацоўкай і ўкараненнем плёначных іёнаселектыўных электродаў. Распрацаваныя ім электроды дазваляюць скараціць час аналізу гальванічных ваннаў у дзесяць—дваццаць разоў. Электроды ўжо прымяняюцца на прадпрыемствах электроннай і гадзіннікавай прамысловасці. Сумарны эканамічны эфект ад іх укаранення склаў больш за сто тысяч рублёў.

Фота **С. Плыткевіча.**

● ДА 40-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ ●



ВЕТЭРАНЫ СЯРОД НАС... Але ці заўсёды ведаем мы іх боль? Ці слухаем мы іх памяць? Іх успаміны — гэта гераічныя старонкі нашага народа, краіны, якія мы не можам, не маем права не ведаць...

Па ініцыятыве рэдакцыі насценнай газеты «Журналіст» на факультэце журналістыкі быў арганізаваны «круглы стол», за якім сабраліся ветэраны Вялікай Айчыннай — супрацоўнікі факультэта і студэнты — члены рэдкалегіі.

С. М. Грабчыкаў, В. І. Дубовік, Г. З. Бягун, Р. В. Булацкі, М. Я. Цікоцкі, Д. П. Жмуроўскі на сустрэчы расказалі студэнтам аб сваёй трывожнай маладосці. Героі вогненных саракавых і камсамольцы 80-х... Розныя пакаленні сустрэліся адно з адным і з памяццю.

Карысная ініцыятыва праяўлена рэдкалегіяй насценкі. За ўвагу ўдзячны ветэраны, за шырокі расказ аб гэтым на аркушах газеты — усе студэнты і выкладчыкі — чытачы насценкі.

**Т. БЯЛЬКЕВІЧ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

**НА ЗДЫМКУ: у час сустрэчы за «круглым сталом».**

Фота **С. Плыткевіча.**

● АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЕКТ ЦК КПСС АБ ШКОЛЬНАЙ РЭФОРМЕ ●

# КЛЮЧАВЫЯ ПЫТАННІ

ВА ЎМОВАХ усеагульнай сярэдняй адукацыі асноўная маса вучняў павінна рыхтавацца да працы, таму на першы план ставіцца задача карэннага паляпшэння працоўнага выхавання, вучобы і прафесійнай арыентацыі вучняў. Гэта задача павінна вырашацца на аснове ранняга выяўлення і інтэнсіўнага развіцця лепшых здольнасцей кожнага школьніка ў рамках яго ўсебаковага развіцця. Вучоным неабходна актывізаваць даследаванні ў гэтым напрамку, каб школа магла практычна вырашаць пытанні прафесійнай арыентацыі на навуковай аснове.

Таленты ў школьным узросце могуць яшчэ не выявіцца, а тыя ці іншыя здольнасці ёсць у кожнага школьніка. **Сказ другі пункта I праекта рэформы, дзе гаворыцца, у прыватнасці, аб шырокіх магчымасцях для выяўлення талентаў, мэтазгодна дапоўніць словамі «развіцця здольнасцей кожнага».**

Аб'ектам клопатаў школы павінны быць як практычныя здольнасці, звязаныя з прафесійнай падрыхтоўкай да працы, так і спецыяльныя здольнасці, якія праяўляюцца пры паглыбленым вывучэнні таго ці іншага цыкла дысцыплін і дазваляюць павысіць якасць падрыхтоўкі для прадаўжэння адукацыі ў вышэйшай школе. Для вырашэння гэтай задачы, як паказаў вопыт, факультатыўных заняткаў недастаткова. Неабходна паступова расшыраць сетку спецыялізаваных фізіка-матэматычных, хіміка-біялагічных, грамадска-гуманітарных класаў для таго, каб у будучым мець іх у кожнай школе.

**У другім абзацы пункта 5 пасля слоў «факультатыўных заняткаў» прапаную прадоўжыць так: «...а ў X—XI класах паступова расшыраць сетку спецыялізаваных па гэтых профілях класаў для таго, каб у перспектыве ахапіць імі ўсе школы, ствараючы роўныя магчымасці для ўсіх».**

Важную ролю ў працоўным выхаванні школьнікаў адыгрывае паўсядзённая праца. Хто ў школе не прывык да добрасумленнай работы, той і ў жыцці не праявіць працавітасці. Неабходны паўсядзённы эфектыўны кантроль падрыхтаванасці да ўрокаў кожнага школьніка, што будзе садзейнічаць выхаванню працавітасці і трываламу авалоданню асновамі навук. Гэта дазволіць настаўніку паспяхова вырашаць задачу павышэння якасці адукацыі і выхавання — першую з асноўных задач рэформы, сфармуляваных у праекце ЦК КПСС.

Вырашэнне гэтай вялікай задачы патрабуе паскоранай распрацоўкі новых прадметных методык, больш эфектыўных, якія вырашалі б задачу вучэння з захапленнем. Для падрыхтоўкі настаўнікаў у ВНУ неабходна адбіраць абітурыентаў з педагагічным прызваннем. Гэтаму адбору і павышэнню якасці прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў матэматыкі садзейнічае навукова-педагагічнае аддзяленне, якое існуе на механіка-матэматычным факультэце універсітэта. Зараз вядзецца работа па ўдасканаленню новага вучэбнага плана гэтага аддзялення.

**М. МЯЦЕЛЬСКІ,**
**дацэнт механіка-матэматычнага факультэта.**

# КАНТРАСТЫ, НЮАНСЫ...

## АБО ЯК СРОДКІ НАГЛЯДНАЙ АГІТАЦЫІ ЗРАБІЦЬ НАГЛЯДНЫМІ

**У канцы лютага камісія партыйнага камітэта сумесна з рэдакцыяй газеты «Беларускі універсітэт» правяла рэйд па праверцы сродкаў нагляднай агітацыі на факультэтах. Публікуемы матэрыял нашага спецыяльнага карэспандэнта адлюстроўвае заклапочанасць усіх членаў камісіі станам нагляднай агітацыі.**

### ◆ ВЫЗНАЧЫМ ПЯЦЬ ПУНКТАЎ...

На практыцы склаліся пэўныя формы агітацыйна-афарміцельскага мастацтва. Да іх адносяцца: заклікі, тэкставыя і малюнкавыя плакаты, тэматычныя выстаўкі, стэнды агітацыйна-масавага зместу, дошкі гонару, насценныя газеты, сатырычныя выпускі і г. д.

Напэўна, не мае сэнсу рабіць заўвагі, спыняючыся на кожнай з гэтых форм па ўсіх факультэтах асобна. Таму што заначаныя ніжэй хібы, памылкі і недарэчнасці з'яўляюцца агульнымі.

Спачатку адзначым некаторыя патрабаванні і недахопы, якія ўласцівы той частцы наглядна-агітацыйных сродкаў, якія адносяцца да доўгачасовых, разлічаных на некалькі гадоў.

Па-першае, яны павінны быць вытрыманы ў пэўным стылі, захоўваць тэматыку, якая б адлюстроўвала спецыфіку таго ці іншага факультэта. Таму, напрыклад, дзіўна было сустрэць на пляцоўцы паверха біяфака, дзе размешчана кафедра мікрабіялогіі, вялізны (ад падлогі да самай столі) стэнд, які заклікаў берагчы помнікі гісторыі і культуры і раіў кожнаму стаць членам таварыства па іх ахове (зазначу, што ён быў бы вельмі да месца на гістарычным факультэце, дзе пакуль што нічога падобнага няма).

Па-другое, не заўсёды дастаткова ўдала зроблены выбар месца для тых ці іншых пано, плакатаў, лозунгаў. Здаецца, што іх змяшчаюць на лесвічных пляцоўках, у вузкіх або цёмных калідорах. Як яскравы прыклад можна прывесці дрэнную арганізацыю гэтай справы на механіка-матэматычным факультэце. У той час, калі на адным канцы калідора, ля дзвярэй камітэта камсамола будатрадаўскія газеты мехмата насоўваюцца адна на другую, перакрыўшы ўсе нормы шчыльнасці і абвісаючы да падлогі (бо ўсе не змяшчаюцца на рэйках стэнда), на другім яго канцы, каля 433-й аўдыторыі — голыя сцены.

Па-трэцяе, наглядная агітацыя патрабуе ўдалай, граматнай кампаноўкі. Між тым на факультэтах не цяжка сустрэць вось такую кампазіцыю: побач, як кажуць, ушчыльную за дошкай для паведамленняў камітэта камсамола вісіць адмысловы плакат, які абвяшчае, што курэнне небяспечна для здароўя. Яны так дапасуюцца адзін да другога, што складваецца ўражанне, быццам гэта пытанне пільна вывучалася на чарговым пасяджэнні камітэта камсамола.

Па-чацвёртае, вялікая колькасць стэндаў на сённяшні дзень патрабуе padнаўлення з тае прычыны, што іх злосна папсавалі нечыя непакараныя рукі. Асабліва гэта датычыць фотаздымкаў на мехмаце і ў журфакаўскім корпусе, дзе займаюцца замежныя студэнты. І яшчэ — пэўна сярод нейкага кола наведвальнікаў універсітэта пачало распаўсюджвацца новае хобі — збіранне пенапластавых літар. Іх не хапае на стэндах, дошках гонару, экранах сацыялістычнага спаборніцтва, тэматычных пано. «Класічны» прыклад таго, чым гэта паграджае на будучае, ужо сёння маецца на юрыдычным факультэце, дзе на адным са стэндаў замест назвы «Кафедра крымінальнага права» засталася толькі адна літара «п».

Па-пятае, на кожным факультэце, студэнтам якога даводзіцца працаваць з электрычнасцю, хімічнымі элементамі, ды наогул з тэхнікай, абавязкова павінны быць плакаты, дапаўняючыя сабой адпаведныя правілы і інструкцыі па тэхніцы бяспекі. Як ні парадаксальна, але такія плакаты ва універсітэце можна ўбачыць пакуль што толькі на адной са шматлікіх кафедр.

### ◆ ПА ЗАКОНАХ УСПРЫМАЛЬНАСЦІ

Цяпер звернемся да той часткі нагляднай агітацыі, якая адносіцца да апаратыўных форм уздзеяння на чалавека. І адразу ж сярод недахопаў факультэцкіх «агітак» адзначым вельмі нізкі каэфіцыент гэтай аператыўнасці. Мяркуйце самі: ці ж можна назваць кемлівай, як кажуць, на стрыжні падзей, работу агітатараў на філфаку, калі ў іх да гэтай пары яшчэ красуецца «Графік выканання работы на першы семестр па рускай мове і літаратуры»? Або іх фізфакаўскіх калег, якія кожны дзень мінаюць дошку з «Экранам сацыялістычнага спаборніцтва за 1982 год» і стэнд «Нашы лепшыя студэнты»? Пра ўзрост апошняга адзін мой знаёмы паведаміў так: «Калі б на гэтых здымках у хлопцаў раслі бароды, то ўсе яны даўно былі б падобны на дзядуль». Але, відаць, фізікам будзе цяжка спаборнічаць з радыёфізікамі, у якіх на кафедры РТ і ФЭ вісіць выдатна зроблены стэнд сацыялістычных абавязацельстваў па дастойнай сустрэчы XIX з'езда ВЛКСМ. Як кажуць, каментарыі не патрэбны.

Асобна хочацца адзначыць насценны друк. І тут справы ідуць не лепшым чынам. Відавочна, што нумары газет на факультэтах паяўляюцца эпізадычна, без цвёрдага падпарадкавання графіку. Не было нічога ў дзень праверкі на стэндзе мехматаўскай «Рошым любую задачу», не пашанцавала таксама ўбачыць «Слова філолага». Да гэтай пары студэнтаў і супрацоўнікаў віншуе з Новым годам «Віта»...

Аператыўна адгукаюцца на падзеі, у тым ліку здолелі выпусціць асобныя нумары, прысвечаныя 40-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, толькі рэдакцыі ФПМ і факультэта журналістыкі.

У апошні час насценныя газеты ўсё часцей і часцей запаўняюцца фотаматэрыяламі з выкарыстаннем тэкстаў. Яны, зробленыя па гарачых слядах падзей і мерапрыемстваў, безумоўна, выклікаюць зацікаўленасць. Вобразнае і эмацыянальнае ўздзеянне дакументальнага здымка, дзякуючы даставернасці адлюстраванага, вельмі вялікае. Але фотаматэрыялы не могуць даць такой абагульненай і накіраванай інфармацыі, якую здольны ўмясціць у сабе газетны артыкул або нават замалёўка.

Хачу дадаць, што не маюць выгляду, і, зразумела, не чытаюцца тэксты артыкулаў, напісаных ад рукі. І калі нам ужо даўно не ўсё роўна, як напісана нешта ў газеце, то тым больш павінна турбаваць, што там і пра што напісана. А то як бы на старонках агітацыйна-масавых лісткоў, газет і заклікаў не пачалі паяўляцца «бессмяротныя» опусы наступнага зместу:

**Не жалею, не зову, не плачу...**
**Пролетит и этот курс как дым.**
**Горем я лишь оттого охвачен,**
**Что не буду больше молодым.**
**Практика, теории тиски.**
**Сдать бы, сбросить, скинуть —**
**Вот предел несбыточной мечты!**

Гэта «твор» быў знойдзены на адным з паверхаў юрыдычнага факультэта ў газеце, ва ўсю даўжыню верхняй часткі якой сляпіла вочы чорным: «Яго шумная і самаўпэўненая вялікасць 2-гі курс». Нішто сабе агітацыя!

Выклікае заклапочанасць і тое, што рэдка дзе можна ўбачыць «Маланку», або лістоўку «Камсамольскага пражэктара». Амаль «вымерла» на старонках насценнага друку сатырычная карыкатура.

Маецца прапанова да кіраўніцтва факультэтаў: пэўна, ёсць сэнс пры комплексным афармленні таго ці іншага факультэта, кафедры стварыць мастацкі савет для вырашэння ўсіх пытанняў, у тым ліку і матэрыяльных. Магчымым з'яўляецца і звяртанне за дапамогай да студэнтаў-дызайнераў тэатральна-мастацкага інстытута. Тым больш, што работа па афармленню факультэта можа стаць для апошніх курсавой.

Бо як бы там ні было, а агітацыйнае афармленне — спецыфічны від выяўленчага мастацтва. І сваё высокае прызначэнне сродкі нагляднай агітацыі выканаюць тады, калі будуць не толькі канкрэтнымі, надзённымі, мэтанакіраванымі, цесна звязанымі з жыццём і справамі калектыву, але калі будуць адпавядаць апошнім дасягненням у гэтай галіне.

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**наш кар.**

● ПРЭСАЎТАКЛУБ ●

## НА ЗІМОВАЙ ДАРОЗЕ

ЗІМОЮ часта бывае так, што ў адзін і той жа дзень надвор'е мяняецца некалькі разоў: то адліга, то мароз, то галалёд, то снегапад. І ўсё гэта павінен улічваць вадзіцель, які сеў за руль дзяржаўнага ці асабістага транспарту. Аднак аналіз дарожных здарэнняў паказвае, што далёка не ўсімі выконваюцца нават элементарныя патрабаванні правіл. Напрыклад, выбар хуткасці і захаванне неабходнай дыстанцыі з улікам умоў дарогі і тармазнога шляху аўтамабіля, які рэзка павялічваецца пры галалёдзе.

Іменна гэта стала прычынай няшчасця для студэнткі 5 курса БПІ А. Сарокінай. Едучы на аўтамашыне «Жыгулі» па вуліцы Я. Коласа па мокрай дарозе, яна рэзка затармазіла, у выніку чаго машыну занесла і яна наехала на аўтамашыну таксі, збіўшы пры гэтым вадзіцеля Рыжанаву, якая стаяла побач. Грамадзянцы Рыжанавай нанесены цялесныя пашкоджанні.

Значная колькасць дарожна-транспартных здарэнняў адбываецца па віне пешаходаў і ўладальнікаў асабістых аўтамабіляў — студэнтаў і супрацоўнікаў ВНУ. Дастаткова сказаць, што ў 1983 годзе з-за невыканання элементарных патрабаванняў правілаў дарожнага руху студэнтамі і прафесарска-выкладчыцкім саставам БПІ адбылося 8 дарожна-транспартных здарэнняў. Шэсць—з удзелам уладальнікаў індывідуальных транспартных сродкаў. Сярод парушальнікаў правілаў дарожнага руху студэнты А. Касцючыц, Ю. Кузнецкі, супрацоўнікі інстытута В. Краўчанка, В. Барноўскі, В. Юдзянілаў, А. Антонаў.

Часта даводзіцца чуць з нагоды розных інцыдэнтаў на дарозе: «Хто мог падумаць, што такое здарыцца?» І сапраўды, нечаканы манеўр часта становіцца прычынай аварыі. Большасць дарожна-транспартных здарэнняў у горадзе адбываюцца з-за няўмення некаторых вадзіцеляў прагназіраваць сітуацыю, хутка зразумець намер другога вадзіцеля ці пешахода.

«Ездзі выразна!» — гэта лозунг вопытных, дысцыплінаваных вадзіцеляў. Ён азначае, што заўсёды патрэбна своечасова папярэджваць аб манеўрах, займаць правільнае становішча на дарозе. Гэта дапаможа іншым вадзіцелям і пешаходам лепш арыентавацца ў інтэнсіўным патоку транспарту, выбіраць правільнае рашэнне, будзе садзейнічаць бяспецы руху.

Зімою патрэбна звяртаць увагу на захаванне інтэрвалу і дыстанцыі руху, быць асабліва ўважлівым пры абгоне і аб'ездзе. Асабліва асцярожна патрэбна праязджаць міма прыпынкаў грамадскага транспарту.

Змена надвор'я заўсёды патрабуе ад вадзіцеляў увагі і асцярожнасці. У тумане патрэбна ехаць з невялікай хуткасцю і абавязкова пры бліжнім святле фар. Але лепш выкарыстоўваць спецыяльныя супрацьтуманныя фары з нізкім і шырокім пучком святла. Пры вымушанай астаноўцы аўтамабіля ў снегапад ці туман абавязкова патрэбна ўключыць габарытныя ці стаяначныя агні.

Для зніжэння колькасці дарожна-транспартных здарэнняў, а таксама правапарушэнняў сярод уладальнікаў індывідуальнага транспарту і пешаходаў неабходна актывізаваць работу савета прафілактыкі, членаў агіткалектываў, таварыства «Аўтамотааматар» і спецдружыны па бяспецы дарожнага руху.

**М. ВАСІЛЬЕЎ,**
**супрацоўнік ДАІ.**

# РУЖОВЫ РАНАК

*Літаратурная старонка*



**Валянцін ЖДАНКО,**
**студэнт журфака**

* * *

Хай лёсы скрыжаваныя
Дадуць зямлі сады.
Галінкамі зламанымі
У іх — твае сляды.

Са слоў чароўных сплецены
Жалобны сумны гук.
Пялёсткі цуда-квецені
Дратуе майскі жук.

І не даспелі — згінулі
Чаканыя плады.
Адчайна рукі ўскінулі
Счарнелыя сады.

* * *

На світанні, мама, запалі ў печы,
Са старэнькай студні прынясі вады...
Ахінае восень адзінотай плечы
Ды глядзіцца ў шыбы месяц малады.

Цішыню ў хаце абудзілі дзеці —
Ужо пара, матуля, падаваць на стол...
Стукае ў дзверы зледзянелы вецер,
Маразы без часу скамянілі дол.

* * *

Постаць хавае ноч,
Гулка чаканне крочыць.
Бровы, як крылы,— узбоч,—
Я сустракаю Вочы.
Повен загадак свет —
Позірк згадай Мадонны —
Вочы — глыбокі след,
Мой неспакой бяздомны.
...Пошук дзён і начэй —
На берагах шашы.
Рве размову вачэй
Дымны табун машын.

* * *

Жыву адным вяртаннем
Туды, дзе сіл не трацiў.
Туды, дзе летнім раннем
Мяне будзіла маці.

Дзе не было балюча,
Дзе крыўда — на гадзіну.
Дзе подых траў гаючых
Тугу і боль супыніць.

Грымотны цёплы лівень
Абмые пыл з дарогі.
На ёй сляды пакіне
Двайнік мой басаногі.

Пах бэзавых світанняў
І дотык рук дзявочых...
Жыву адным вяртаннем,
Што час мне напрарочыў.

### У БРЭСЦЕ

Крокі.
Вострыя і марудныя.
Пліты —
Белы маёвы снег.
Глыбінёю маўчання суднага
Абрываюць дзяўчаты смех.

Памяць.
Чытае — перачытае
Вочы
Бачаць праз кроплі слёз,

Прыпадае, адчаем скутая,
Цішыня да дзявочых ног.

Паднімаецца часу сходнямі
З-пад руін безгалосы крык...
Ды крамсае вятры заходнія
Стометровы салдацкі штык.

## «БУДЗЕМ, ЛЮДЗІ, ШЧАСЛІВЫ ЎСЕ!»

МАЛАДЫ беларускі паэт Алесь Пісьмянкоў выдаў сваю першую кнігу вершаў «Белы камень» (Алесь Пісьмянкоў. «Белы камень», Мінск, «Мастацкая літаратура», 1983).

Не прэтэндуючы на ролю літаратурнага крытыка, выкажу свой пункт гледжання як чытач, як равесніца Алеся, яго сучасніца.

Будучы вучаніцай 9—10 класаў, мне давялося двойчы ўдзельнічаць у абласным злёце маладых паэтаў і празаікаў Магілёўшчыны. Яшчэ тады прыцягнулі да сябе ўвагу літаратараў сваёй непаўторнасцю, шчырасцю, свежасцю слова вершы старшакласніка з вёскі Бялынкавічы Алеся Пісьмянкова. Ён неяк нясмела чытаў свае вершы, хвалюючыся і чырванеючы. Затое ўважліва слухаў парады прафесійных літаратараў і сваіх таварышаў. На злёце Алесь быў узнагароджаны дыпломам. Пазней я з вялікім інтарэсам чытала яго вершы ў «Магілёўскай праўдзе», «ЛіМе», журналах «Маладосць», «Полымя», «Беларусь». Яго вершы высока ацаніў А. Пысін.

Нарадзіўся Алесь Пісьмянкоў у 1957 годзе. У 1980 годзе ён скончыў філалагічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна. Працаваў у касцюковіцкай раённай газеце, штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», зараз ён — рэдактар аддзела навукі і мастацтва часопіса «Полымя».

Поспех маладога паэта звязаны з тым, што ён піша пра дарагое, блізкае, тое, што ён бачыў сваімі вачыма.

З якой цеплынёй і любоўю піша Алесь Пісьмянкоў пра Радзіму, пра родную зямлю, пра той край, дзе ён нарадзіўся і вырас:

**Мая маленькая**
**зямля!**
**Уся ў палыне**
**і медуніцы.**
**З тваіх крыніц**
**мне не напіцца,**
**Хоць буду піць**
**і спакваля,**
**Жыві ж, жыві!**
**Плыві між зор!**
**І чуюць хай на**
**усіх планетах,**
**Як пахнуць кветкі**
**і ранеты**
**У нашых вёсках**
**ля азёр.**

Глыбокімі каранямі прарасла паэзія А. Пісьмянкова ў гісторыю беларускага народа, гісторыю роднага краю («Балада роду», «Кушлянская балада», «У Каменцы»).

Лірычны герой Пісьмянкова — шчаслівы чалавек, «не пакрыўджаны лёсам», працавіты, моцны духам. Паэт «моцна любіць свет вялікі, узлёт душы і ўзлёт крыла», свята беражэ любоў і дружбу («Сябру», «Я прачытаў твае сляды»), цёпла і задушэўна піша пра свае студэнцкія гады, таварышаў, добрым словам успамінае аднасяльчан.

Ёсць у паэта і філасофскія радкі — роздум аб сэнсе жыцця чалавека, хвалюючыя —аб бязлітасных адносінах да прыроды:

**А дзе ж ты, розум**
**здаровы?**
**Чэзне прырода ў**
**слязах.**
**Бачыш, як Бесядзь**
**нервова**
**Б'ецца ў сваіх**
**берагах.**
**А дзе ж ты, розум**
**здаровы?**
**Без песень**
**мярцвеюць гаі,**
**Грыбы ўцякаюць**
**з дубравы,**
**Толькі ў паэтаў**
**жывуць салаўі.**

Асаблівай пяшчотай пранікнуты радкі А. Пісьмянкова аб роднай вёсцы, «дзе самы белы ў свеце снег». Паэт жыве і працуе ў Мінску, але родныя мясціны заўсёды ў сэрцы паэта, якому «так хочацца дахаты ў камарыныя бары». У вершах паэта — глыбокі роздум пра лёс сучаснай вёскі.

Характэрная рыса Алеся Пісьмянкова— чуласць і дабрата. Яны пульсуюць у кожным яго радку.

Багата Магілёўшчына на таленты. Гэта зямля падарыла літаратуры такія выдатныя імёны, як Аркадзь Куляшоў і Аляксей Пысін, Платон Галавач і Максім Гарэцкі, Аляксей Русецкі і Міхаіл Стральцоў і многія іншыя. Пройдзе час, і побач з гэтымі імёнамі паявяцца новыя, нікому зараз невядомыя. І паэтычны зборнік нашага выпускніка яшчэ раз пацвердзіў тое, што расце дастойная маладая паэтычная змена.

**Т. МІХАЛЬЧУК,**
**аспірантка кафедры рускай мовы.**

**Аляксандр БЕЛЬСКІ,**
**студэнт філфака**

* * *

Верасནёвыя птушкі інтэрнат абудзілі.
Гэтай сустрэчы чакалі з табой.
Знаёмыя дзверы хутчэй адчынілі:
«Дзень добры, сябры і стары наш пакой!»
Музыка, гоман, смех і абдымкі...
Сценам даўно надакучыў спакой!
А заўтра вучоба—і ўсе без затрымкі
Ранкам пакінем утульны пакой.
Пах хлеба і сала, як зойдзеш, тут чуеш,
Торт, каўбаса ўсміхнуцца парой.
Чаем заўсёды цябе пачастуе
Гасцінны, прыветны студэнцкі пакой.
Як толькі няўдача ўдарыла громам
І цяжка змагацца з навісшай бядой,
Да нас паспяшай! І справай, і словам
Табе дапаможа студэнцкі пакой.
Вядома, студэнты да песень ахвочы,
А дзе гітарыст, там дзяўчаты гурбой.
І часам шуміць аж да позняе ночы
Гарэза-свавольнік студэнцкі пакой.
Бывае, што сум запалоньвае грудзі:
Дні беззваротна ідуць чарадой...
Нялёгка расстацца з табою нам будзе,
Любімы і родны студэнцкі пакой.

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

АТ 10097 Зак. 370.

1 сакавіка 1984 г.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ